ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

,90

ЧАЦВЕР 22 ЛЮТАГА № 6(1635)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ЗВАРОТ ДА ВЫБАРШЧЫКАЎ

КАНДЫДАТА Ў НАРОДНЫЯ ДЭПУТАТЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР ДОКТАРА ФІЗІКА-МАТЭМАТЫЧНЫХ НАВУК, ПРАФЕСАРА ІГАРА АЛЯКСАНДРАВІЧА МАЛЕВІЧА

Пытанне сёння ставіцца так: ці пойдзем мы наперад, ці будзем адкінуты назад. Інфляцыя, пагаршэнне жыцця, маёмасная няроўнасць, рост злачыннасці, абвастрэнне міжнацыянальных адносін выклікаюць незадаволенасць людзей і няўпэўненасць у заўтрашнім дні.

Мы падышлі да выбараў, маючы ў рэспубліцы каля 2 мільёнаў чалавек, якія жывуць за мяжой беднасці, велізарную нястачу жылля, масавыя захворванні дзяцей і рэальную пагрозу знішчэння нацыі пасля выбуху ў Чарнобылі і хімічнага атручвання зямлі і паветра.

Агульначалавечыя, гуманітарныя, культурныя каштоўнасці знаходзяцца пад пагрозай.

Лічу неабходным перад сваімі выбаршчыкамі заявіць сваю пазіцыю і платформу па асноўных прынцыповых пытаннях.

ПАЗІЦЫЯ

Упэўнены, што для развіцця нашага грамадства патрабуецца:

Забяспечыць дзяржаўныя і канстытуцыйныя гарантыі асноўных фундаментальных правоў і свабод чалавека. Іх мінімальны аб'ём вызначаны ў асноўных міжнародных дакументах і не павінен абмяжоўвацца ў аднабаковым парадку ніякімі рэспубліканскімі, саюзнымі, палітычнымі органамі.

ЛІЧУ НЕАБХОДНЫМ АДМЕНУ ЎСІХ ЗАКОНАЎ, ЯКІЯ СУПЯРЭЧАЦЬ ВЕНСКАЙ КАНВЕНЦЫІ 1989 Г.

ПАТРЭБНА АДМОВІЦЦА ад вобразу дзяржавы-дабрадзейкі народа. Нам патрэбна дзяржава — орган народнай улады, інструмент гарманізацыі грамадства на аснове новай Канстытуцыі. Раздзяленне заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады павінна быць абавязковым.

РЭАЛІЗАВАЦЬ НА СПРАВЕ, А НЕ НА СЛОВАХ ПРЫНЦЫПЫ САЦЫЯЛЬНАЙ СПРАВЯДЛІВАСЦІ. Адмяніць закрытую ад грамадства сістэму льгот і прывілей, наменклатурнае размеркаванне даброт.

У першую чаргу неабходна забяспечыць сацыяльную і эканамічную абарону бяднейшых слаёў грамадства — пенсіянераў, інвалідаў, моладзі, студэнцтва, ваеннаслужачых, адзінокіх дзяцей і жанчын. Неабходна заканадаўча ўвесці сістэматычную кампенсацыю ўзрастання цэн і пакупной здольнасці рубля ўсім катэгорыям працуючых і пенсіянерам.

СТВАРЫЦЬ УМОВЫ І ГАРАНТАВАЦЬ СВАБОДУ шырокіх кантактаў з усім светам, у першую чаргу, маладзёжных, навуковых, культурных і эканамічных. Спаўна выкарыстоўваць прыярытэтнае права краін-членаў ААН.

Беларусь — раўнапраўны член Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. ПАТРЭБНА пачаць рэальна карыстацца правамі, а не выконваць у ААН ролю статыста. Дабіцца неадкладна міжнароднай дапамогі ААН пацярпеўшым ад выбуху ў Чарнобылі. Патрэбна, выкарыстоўваючы ўсе здольнасці сусветнага таварыства — эканамічныя, культурныя, навуковыя, нацыянальныя, асабістыя кантакты, паспець ускочыць у адыходзячы цягнік сучаснай цывілізацыі.

АДМОВІЦЦА АД ПРЫНЦЫПУ МАНАПОЛІІ ЎЛАДЫ і перайсці да рэальнай, у тым ліку асабістай, адказнасці перад народам за прымаемыя рашэнні. Стварыць умовы і гарантыі правядзення рэферэндумаў пры вырашэнні ўсіх агульнанацыянальных праблем — галоснасць ва ўсіх сферах дзейнасці, уключаючы дзейнасць вышэйшых эшалонаў улады.

Усім сёння бачны няздольнасць і нежаданне цяперашняй адміністрацыі вырашаць асноўныя праблемы жыцця людзей. Пазбавіць улады асоб, якія, прыкрываючыся лозунгамі перабудовы і сацыялізму, імкнуцца рэстаўрыраваць сталінізм і брэжнеўшчыну. Неабходна адмовіцца ад бюракратычна-камандных прынцыпаў у рабоце дзяржаўных інстытутаў, асабліва ў галіне ідэалогіі, навукі, палітыкі, культуры, мастацтва.

Платформа

Заяўляю, што ў выпадку майго абрання ўсімі даступнымі дэпутату сродкамі, абапіраючыся на давер і падтрымку выбаршчыкаў, буду дамагацца:

— Стварэння ўмоў эканамічнай, сацыяльнай, палітычнай абароненасці асобы і буду перашкаджаць усялякім спробам яе абмежавання.

Канстытуцыя павінна гарантаваць парадак змяняльнасці ўлады. Скасаваць кааптацыю і бюракратычныя перастаноўкі ў вышэйшых эшалонах улады.

— Неабходна спыніць развал эканомікі і абядненне працоўных. Прыняць законы аб уласнасці і зямлі. Здзейсніць рэальную самастойнасць прадпрыемстваў, спыніць развіццё і ўмацаванне мафіі, спыніць мілітарызацыю краіны.

— Перагляду аднабаковага, абмежаванага падыходу ў галіне экалогіі. Спыніць лакіроўку вынікаў чарнобыльскай трагедыі і ігнараванне пагрозы экалагічнаму балансу рэспублікі з боку дзеючых АЭС.

Забараніць захаванне хімічных, радыёактыўных і таксічных адходаў.

Неабходна прыпыніць сельскагаспадарчае прамысловае будаўніцтва, якое вядзецца за кошт экалагічнага ўрону.

Кожны чалавек павінен мець права на абарону суда і эканамічную кампенсацыю за ўрон, які быў нанесены яго здароўю ў выніку экалагічных злачынстваў.

— Духоўнага і культурнага нацыянальнага абнаўлення грамадства. Карэннага змянення утылітарнага, прагматычнага падыходу да праблемы адукацыі, нацыянальнай культуры, мастацтва і мовы. Адмены існуючай сістэмы адміністрацыйнага кіравання адукацыяй і культурай.

Наша сістэма адукацыі сёння не вырашае дадзеных праблем. Адукацыя ў нас знаходзіцца «за парогам цывілізацыі». Яна не з'арыентавана на раскрыццё інтэлектуальных здольнасцей чалавека і акамянела пад прыгнётам традыцыйных догмаў.

Выступаю за вольны прыём-запіс ва універсітэты. Гэта не буржуазная раскоша, а жыццёвая неабходнасць.

Выступаю за стварэнне новага вольнага нацыянальнага Беларускага універсітэта з асабістай сістэмай ліцэяў і каледжаў па ўсёй рэспубліцы. Новы нацыянальны Беларускі універсітэт здольны ў кароткія тэрміны стварыць аб'ектыўныя ўмовы для натуральнага, а не камандна-дэкларатыўнага распаўсюджання ў грамадстве заняпаднай нацыянальнай культуры, мовы, нацыянальных мастацтваў, літаратуры і навукі.

Упэўнены, што ёсць выхад з крызіснай сітуацыі, асабліва ў нашай рэспубліцы, якая, нягледзячы на кансерватызм кіраўніцтва, валодае магутным інтэлектуальным патэнцыялам.

І. А. МАЛЕВІЧ.

НАША ВІЗІТКА



Ігар Аляксандравіч МАЛЕВІЧ нарадзіўся ў лістападзе 1941 года ў Мінску. З 1946 да 1965 года жыў на Грушаўскім пасёлку. Закончыў сярэднюю школу № 3 г. Мінска. Пачынаў працоўны шлях слесарам на вагонарамонтным заводзе. Працаваў электрамантажнікам і наладчыкам апаратуры. Закончыў у 1966 годзе Мінскі радыётэхнічны інстытут і ў 1971 — аспірантуру Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Больш дваццаці гадоў працуе ва універсітэце. Член КПСС. Прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне навукі і тэхнікі. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола рэспублікі ў галіне навукі і тэхнікі.

Аўтар трох кніг, дзве з якіх перакладзены за мяжой. Апублікаваў больш за 200 навуковых работ. Аўтар амаль ста вынаходніцтваў.

Запрашаўся для чытання лекцый і навуковай работы ў Фінляндыю, ФРГ, ЗША (Гарвардскі, Стэнфардскі, Тэхаскі універсітэты).

Жанаты, мае дачку і ўнучку.

НА МОЙ ПОГЛЯД

Слова пра калегу

Я выдатна ведаю Ігара Аляксандравіча па рабоце ў Белдзяржуніверсітэце. Мы часта сустракаемся з ім, абмяркоўваем актуальныя пытанні оптыкі і радыёфізічных дадаткаў. І. А. Малевіч актыўна працуе над стварэннем радыёфізічных сістэм дыстанцыйнага зандзіравання высокага вырашэння, якія вельмі важныя для вывучэння стану навакольнага асяроддзя і атмасферы, мора, зямной паверхні.

Пры непасрэдным удзеле Ігара Аляксандравіча ў Беларускім дзяржаўным універсітэце створаны Навуковы цэнтр аэракасмічнай дыягностыкі прыродных рэсурсаў Зямлі. Ён як намеснік дырэктара кіруе і сам карпатліва займаецца вывучэннем экалагічных праблем, укараняе самыя сучасныя навуковыя метады зандзіравання навакольнага асяроддзя.

Вынікі даследаванняў І. А. Малевіча прызнаны ў навуковым свеце. Ён паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю ў Інстытуце фізікі АН БССР. Вядомы спецыяліст у галіне оптыкі і радыёфізікі з Дзяржаўнага аптычнага інстытута ў Ленінградзе, член-карэспандэнт АН СССР А. М. Бонч-Бруевіч, які выступаў у якасці апанента, высока ацаніў работу Ігара Аляксандравіча.

Сёння манаграфіі прафесара І. А. Малевіча шырока вядомыя ў нашай краіне, пераведзены за мяжой.

М. ЕЛЬЯШЭВІЧ,
акадэмік АН БССР,
лаўрэат Ленінскай
і Дзяржаўнай прэмій
СССР.

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

Прафесар Малевіч распрацаваў новы навуковы напрамак радыёфізікі — статыстычная хранаскапія субнанасекуднага вырашэння, які мае прынцыповае значэнне для развіцця тэарэтычных падыходаў да аналізу і сінтэзу радыёфізічных сістэм вышэйшай дакладнасці. Яго распрацоўкі з'яўляюцца базай для стварэння тэхнікі новых пакаленняў для даследавання хуткапрацякаючых працэсаў у спектральным дыяпазоне ад ультрафіялетавай да інфрачырвонай галіны спектра, у тым ліку і крайне слабай інтэнсіўнасці на фоне шуму.

Пад кіраўніцтвам Ігара Аляксандравіча Малевіча на кафедры ажыццяўляецца мэтавая падрыхтоўка навукова-інжынерных кадраў для НВА «Планар».

Я. АНЕГІН,
генеральны дырэктар НВА «Планар»,
член-карэспандэнт АН БССР.

Што я думаю пра свайго прафесара

Асабіста я мяркую пра Ігара Аляксандравіча, у першую чаргу, па тых лекцыях, якія ён нам чытае. Не ведаю, магчыма, гэта звязана з тым, што Ігар Аляксандравіч мае вопыт выкладання ў замежных універсітэтах, але на яго занятках мы сапраўды адчулі патрэбу атрымліваць веды.

Ён ніколі не прад'яўляе да нас дагматычных патрабаванняў. На практычных занятках патрабуе не сухі пераклад асобнай часткі прачытанага курса, а ўмення выкарыстоўваць тэорыю ва ўсім аб'ёме, дае магчымасць праявіць сваю эрудыцыю.

І само выкладанне матэрыялу Ігар Аляксандравіч будуе так, каб мы не аўтаматычна завучвалі яго, а бачылі і разумелі ўвесь ход роздумаў, вучыліся думаць, выкарыстоўваць свае веды для вырашэння канкрэтных задач.

Зараз шмат гавораць аб неабходнасці ўвядзення прагрэсіўных метадаў выкладання ў ВНУ. Дык вось, мне здаецца, у аснове навучання ўсё роўна будуць ляжаць узаемаадносіны выкладчыка і студэнта — настаўніка і вучня. І для мяне вельмі важна, што я адчуў на сабе, што значыць, калі прафесар размаўляе з табой, як з калегай.

А. ШАЙКО,
студэнт V курса факультэта радыёфізікі і электронікі.

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

На працягу многіх гадоў прафесар Ігар Аляксандравіч Малевіч вядзе актыўную работу ў Навуковым савеце АН СССР. Ён з'яўляецца арганізатарам трох Усесаюзных нарад па статыстычных метадах апрацоўкі даных дыстанцыйнага зандзіравання навакольнага асяроддзя. Навуковы савет АН СССР па праблематыцы «Статыстычная радыёфізіка» шматразова адзначаў дасягненні І. А. Малевіча ў галіне дыстанцыйнай дыягностыкі навакольнага асяроддзя, як важныя і важнейшыя.

Ю. КОБЗАРАЎ,
старшыня Навуковага савета Прэзідыума АН СССР па праблеме «Статыстычная радыёфізіка», акадэмік АН СССР.

ХТО ЁСЦЬ ХТО

ПРАФЕСАР МЯНЯЕ ПРАФЕСІЮ

Пра фізікаў «лірыкам»-гуманітарыям пісаць няпроста. Не таму, што спрэчка паміж імі даўняя, народжаная пад рамантычным арэолам хрушчоўскай адлігі. Сёння складанасць сітуацыі ў тым, што галоснасць, адкрытасць абмеркавання самых вострых пытанняў сучаснасці паставілі на грамадскі агляд праблемы, якія яшчэ ўчора здаваліся спецыяльнымі, не даступнымі для шырокага разумення. Так здарылася і з фізікай. Прадстаўнікам гэтай навукі, а яна ў масавай свядомасці зараз самым цесным чынам звязана з чарнобыльскімі падзеямі, даводзіцца трымаць адказ перад грамадствам.

Зразумела, нават наша даволі сціплая адукацыя ў гэтай галіне дапускае, што не ўся фізіка — тая самая, «чарнобыльская». І ўсё ж такі...

У маральным, этычным плане сёння адказнасць вучонага-фізіка не тое, каб заўважна ўзрасла. Яна напоўнілася новым, сацыяльна важным зместам, які закранае жыццёвыя інтарэсы мільёнаў людзей. Думаю, што ўсведамленне гэтага факта як не да канца выкананага перад грамадствам абавязку падштурхнула Ігара Аляксандравіча Малевіча, спецыяліста ў галіне радыё- і лазернай фізікі, да вылучэння сваёй кандыдатуры ў народныя дэпутаты Беларускай ССР. Што ж можа зрабіць карыснага і неабходнага для людзей вучоны і грамадзянін І. А. Малевіч?

У яго перадвыбарнай платформе я б вылучыла тую частку, якая звязана непасрэдна як з навуковым, спецыяльным профілем, так і з канкрэтнымі сацыяльнымі задачамі рэспублікі. Асноўная ідэя заключаецца ў тым, каб аб'яднаць намаганні фізікаў, хімікаў, біёлагаў, матэматыкаў, геграфаў, сацыёлагаў, карацей, вялікі навуковы патэнцыял універсітэта ў цэнтры, дзейнасць якога была б накіравана на комплекснае вывучэнне і вырашэнне праблем навуковай экалогіі. У аснове работы гэтага навуковага цэнтра — методыка па дыягностыцы прыродных рэсурсаў Зямлі, асяроддзя знаходжання чалавека, карацей, праблемы, якімі Малевічу ўжо даводзілася займацца. Першы крок да стварэння такой навуковай арганізацыі зроблены, і фактычна яна ўжо існуе — на грамадскіх пачатках.

Гэтыя славутыя «грамадскія пачаткі» загубілі ўжо не адну плённую ідэю. Таму не буду пералічваць цяжкасці, з якімі сутыкнуўся І. А. Малевіч, «прабіваючы» свае прапановы ва ўрадзе рэспублікі. Зараз прынята праграма, на думку аўтара, не самая лепшая. Яна датычыць тэматыкі, звязанай з сельскагаспадарчай дзейнасцю. Але пытанне вучоным пастаўлена значна шырэй. Ён перакананы ў тым, што не эмоцыі, а дакладны разлік, аб'ектыўныя даследаванні, якія грунтуюцца на дыягностыцы і метралогіі прыроднага асяроддзя, здольныя даць, у прыватнасці, і адказ на пытанне, якое хвалюе кожнага беларуса пасля чарнобыльскай аварыі. Стварэнне спачатку нацыянальнай інфармацыйнай тэхналогіі ў сферы экалогіі, потым уключэнне гэтай сістэмы ў агульнаеўрапейскую і сусветную сетку экалагічных банкаў ведаў — гэта надзейная гарантыя для прыняцця правільных рашэнняў у сацыяльным і гаспадарчым жыцці Беларусі.

Час «працуе» на гэта вялікае пачынанне. Але гэта — з галіны зноў жа эмоцый. Прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, загадчык кафедры радыёфізікі і оптаэлектронікі І. А. Малевіч выдатна разумее, што тут патрэбны зусім не кабінетныя намаганні. А вопыт «хаджэння па інстанцыях» пераконвае, што высокі прафесіяналізм павінен быць нормай не толькі ў навуцы, але і ў палітыцы. Уласна, думаць вялікімі катэгорыямі Ігара Малевіча з маладосці прывучыла яго навуковая спецыялізацыя.

Адным са сваіх настаўнікаў прафесар лічыць акадэміка А. Н. Сеўчанку, зараз нябожчыка, у мінулым на працягу многіх гадоў рэктара універсітэта. Акадэмік любіў падкідваць вучням складаныя і, здавалася б, безнадзейныя праблемы. Малевічу дасталася праблема лазернай лакацыі касмічных аб'ектаў, уключаючы Луну і штучныя спадарожнікі Зямлі. Па тых часах нешта фантастычнае, хоць прастору і баразнілі першыя спадарожнікі і касмічныя караблі. Ішлі 70-я гады, і парадокс гэтага часу, які мы асацыруем сёння з «росквітам» застою, быў у тым, што думка настойліва рвалася з палону казённай зямной параднасці да натуральнага парадку рэчаў менавіта ў космасе.

Задача маладым вучоным была вырашана настолькі паспяхова, што ў 1974 годзе за цыкл работ па даследаванню імаверных і спектральных характарыстык флуарасцэнтнага і квазінагерэнтнага выпраменьванняў і за стварэнне новых радыёфізічных прылад кандыдат навук І. А. Малевіч атрымаў прэмію Ленінскага камсамола Беларусі.

Зараз гэтыя прылады — сінтэзатары дыскрэтнага часу з надзвычай высокай дакладнасцю — сталі асновай такіх сістэм, як касмічная навігацыя, радыёфізічны канал так званай СОІ, сетка метралагічнага эталоннага дзяржаўнага часу і г. д. Але гэта — у космасе. А што ж на Зямлі?

Малевіча заўсёды хвалявала пытанне, чаму такі вялікі разрыў паміж поспехамі навукі і ўзроўнем айчыннай прамысловасці? З калектывам сваёй лабараторыі ён бярэцца за стварэнне аўтаматызаваных сістэм тыпу інтэлектуальных робатаў, якія прызначаны для дыягностыкі выробаў оптаэлектроннай тэхнікі. Універсальнасць і надзейнасць гэтых сістэм сёння даказана тым, што яны знайшлі шырокае выкарыстанне ў розных галінах машынабудавання. У аснове работы гэтых сістэм — каля 25 уласных вынаходніцтваў І. А. Малевіча. Стварэнне новага класа радыёфізічных дыягнастычных сістэм і іх прамысловае ўкараненне ў 1982 годзе было адзначана Дзяржаўнай прэміяй БССР аўтарскаму калектыву, у якім работы праводзіліся пад кіраўніцтвам Малевіча.

Калі востра паўсталі задачы па развіццю метадаў навуковай экалогіі і дыягностыкі навакольнага асяроддзя, І. А. Малевіч са сваімі калегамі А. Ф. Чарняўскім, А. Л. Якушавым, В. М. Кузняцовым прапанаваў прынцып пабудовы і стварэння першага ў краіне аўтаматызаванага лідэра — лазернай прылады для вывучэння атмасферы і гідрасферы. На працягу года былі выкананы неабходныя эксперыменты, і сёння лідэры ўяўляюць сабой самыя эфектыўныя інструменты для даследавання і кантролю забруджаных паветраных басейнаў, вадаёмаў, мораў і Акіяна. Ва ўсіх навуковых цэнтрах краіны «працуюць» гэтыя карысныя прылады.

Апошняе навуковае захапленне прафесара — лазеры для медыцыны. Да 2000 года, марыць вучоны, клініка павінна быць аснашчана лазерамі і дыягнастычнымі ЭВМ. Лазер памерам з паўалоўка для лячэння ўнутраных органаў — ужо сёння беларускія медыкі распрацоўваюць метады іх выкарыстання. Ведаючы якасць нашай урачэбнай дапамогі не па чутках, цяжка паверыць, што хутка гэтыя навінкі распаўсюдзяцца па лячэбных установах рэспублікі. Але, у рэшце рэшт, у І. А. Малевіча за плячыма не толькі ўражваючая колькасць удалых навуковых эксперыментаў. Ён умее дабівацца практычнай рэалізацыі пастаўленай мэты, абапіраючыся на аўтарытэт сваёй навуковай школы не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой.

Ідэі І. А. Малевіча ўкараненыя ў буйных міжнародных праектах. Ён працаваў у Гарвардскім, Стэнфардскім, Мэрыліндскім і Тэхаскім універсітэтах ЗША, удзельнічаў у распрацоўцы лазернай лакацыі касмічных аб'ектаў у Мак-Дональдскай абсерваторыі і Смітсаніянскім цэнтры астрафізікі ЗША, на самай паўночнай у свеце станцыі лакацыі спадарожнікаў у Месьяхові ў Фінляндыі. У выніку гэтых работ сумесна з супрацоўнікамі НАСА (ЗША) Э. Сільверберганам і Еўрапейскага касмічнага агенцтва Р. Вільсанам былі прапанаваны і ажыццёўлены ў абсерваторыях Фінляндыі і Аўстраліі новыя прынцыпы пабудовы сістэм лакацыі спадарожнікаў.

Міжнароднае супрацоўніцтва, удзел у выкананні прапаноў і заказаў з ЗША і НАСА, з Японіі — даводзіцца спачуваць, што ў застойныя гады універсітэту, рэспублікі ўся работа І. А. Малевіча ішла на карысць толькі па частцы «славы». А магла б прынесці і матэрыяльныя выгоды, калі б праекты доўгатэрміновых кантактаў не разбіваліся аб бюракратычныя бастыёны.

Зараз час перамяніўся. І ёсць асаблівы сэнс у тым, што працэсы актывізацыі асобы, выкарыстання шырокага спектра творчага патэнцыялу чалавека «пачуты» ў першую чаргу прадстаўнікамі нашай беларускай навукі. Сярод іх — Ігар Аляксандравіч Малевіч. Аб'ектыўнасць і прынцыповасць, узважанасць і аналітычны разлік — гэта правілы паводзін, прынятыя ў сапраўднай навуцы, аказваецца, неабходныя ў сацыяльнай і палітычнай сферах. Не хачу гаварыць гучных слоў, але адсутнасць інтэлігентнасці на самым высокім упраўленчым узроўні — ці не ў гэтым варта шукаць прычыны тармажэння перабудовы, спынення яе паступальнага руху? Людзі канструктыўнага розуму, здольныя выпрацоўваць нетрадыцыйныя рашэнні, якія ўмеюць знаходзіць магчымасці для іх канкрэтнага ажыццяўлення, рэалісты нашага часу — да іх атрада адношу прафесара Малевіча, вылучанага кандыдатам у народныя дэпутаты Беларускай ССР па Грушаўскай выбарчай акрузе, па «Грушаўцы», дзе ён нарадзіўся і вырас...

Н. ФРАЛЬЦОВА.

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

Прафесар І. А. Малевіч шырока вядомы як вучоны, які ўнёс пэўны ўклад у станаўленне ў нашай краіне такіх напрамкаў навукі і тэхнікі, як лазерныя сістэмы лакацыйнага (у тым ліку касмічнага) інтэрфераметрычнага і доплераўскага тыпаў, лідарныя сістэмы шматфункцыянальнага прызначэння.

Ігар Аляксандравіч вырашыў задачу аднаўлення аптычных характарыстык складаных трас зандзіравання асяроддзя, уключаючы атмасферу, пераходны слой і гідрасферу па выніках рэгістрацыі поўнага профілю сігналаў зваротнага рассейвання. Ён распрацаваў новыя прынцыпы пабудовы і стварыў шэраг прэцэзійных лазерных лакацыйных сістэм, якія выкарыстоўваюцца зараз у дзяржаўнай эталоннай сетцы, у рэгулярных астранамічных эксперыментах з касмічнымі сістэмамі. Ігар Аляксандравіч распрацаваў клас лазерных крыніц з праграміруемымі параметрамі для дыягностыкі атмасфернага паветра.

В. ДЗ'ЯКАЎ,
галоўны інжынер Цэнтральнага канструктарскага бюро «Пеленг».

ІНТЭРВ'Ю ПА АСАБІСТЫХ ПЫТАННЯХ

«ВЯЛІКАЯ» СЯМЕЙНАЯ ТАЯМНІЦА

Фота прафесара С. С. ШУШКЕВІЧА.

Шчыра кажучы, мне не вельмі зразумела, навошта Ігару Аляксандравічу Малевічу дэпутацтва. Больш, чым робіць ён, прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, загадчык кафедры, тэарэтычна і практычна зрабіць немагчыма. І ўсё ж прафесар адважваецца зрабіць гэты крок у галіну палітыкі, з яго навукай, бясспрэчна, мала звязаную.

Але ў гэтым свеце, у якім, як ў няшчаснай сям'і — успомнім Талстога! — усё змяшалася і кожны чалавек, аказваецца, няшчасны па-свойму, магчыма ўсё. Карацей, сам Малевіч — ці лічыць ён сваю сям'ю шчаслівай?

— Напэўна, дом, у які дачка ўрывалася з воклічам: «Прывітанне, рабяты!», можна назваць шчаслівым...

— «Прывітанне, рабяты!» — гэта пра многае гаворыць. Магчыма, Вы хацелі б мець замест дачкі сына?

— Я вырас на Грушаўцы, дзе асноўны «кантынгент» — хлопцы з сем'яў, дзе часта не было бацькоў. Мы — сыны пакалення, якое не вярнулася з вайны.

— Гэта неяк уплывала на Вашы адносіны з дачкой? Дарэчы, як яе завуць?

— Яе завуць Юля. У першым класе яна ведала ўсе песні з «рэпертуара» Шушкевіча, Дземчука...

— Яны Вашы сябры і зараз?

— Зразумела. З улікам фактара занятасці і ўзросту.

— Гэта цікава, чаму Ваша дачка, з дзяцінства знаходзячыся ў асяроддзі фізікаў, не пайшла па Вашых слядах?

— Па-першае, я з лёгкай іроніяй адношуся да жанчын-фізікаў. А, па-другое, калі дачка прасіла дапамагчы рашыць задачу, заўсёды прыходзіла назаўтра са школы ўся ў слязах.

— Чаму?

— Таму што я спецыяльна закладваў у рашэнні памылку. Яна павінна была думаць сама.

— Неверагодна! А як глядзела на гэта Ваша жонка?

— На маю думку, яна толькі рада, што ў сям'і толькі адзін фізік.

Зараз пытанне да жонкі, Валянціны Георгіеўны.

— Як Вы ставіцеся да дзейнасці Ігара Аляксандравіча?

— Даўно ўжо ўзяла за правіла: лепш не умешвацца — нічога не атрымаецца.

— Нават зараз, калі ён рэзка мяняе свой лад жыцця?

— Менавіта зараз гэта залатое правіла дапамагае захаваць у доме прыняты стыль адносін, парадак і чысціню. А калі гаварыць сур'ёзна, сваю работу як фізік Ігар Аляксандравіч не спыняе, ёсць здольныя вучні, ёсць школа.

— А чым, акрамя «падтрымання стылю», напоўнена Ваша жыццё? Я не маю на ўвазе работу — загадванне кафедрай у МДПІ імя А. М. Горкага...

— У нас расце ўнучка. Ёй зараз адзінаццаць месяцаў — гэтым сказана ўсё.

Спадарожнічала з работай у розны час рознае: у маладосці — альпініст-ледасек з яго жорсткай школай дасягнення мэты; пазней з'явілася захапленне жывапісам, калекцыяніраванне, рыбалка.

Але сёння — зноў канцэнтрацыя сіл. Як некалі ля падножжа гор. З нараджэннем Кацюшы (унучкі) асабліва востра адчуў, што значыць безабароннасць. У наш век экалагічных няшчасцяў мы не здолеем зберагчы гэтых ні ў чым не павінных малышоў, калі не зойдзем практычным увасабленнем у жыццё зыпрацоўваемай вучонымі ўсяго свету канцэпцыі выратавання чалавецтва.

Цэльнасць, якая выклікае павагу.

Дзе гэта? У нашым горадзе, дзе ўсеагульная прапускная сістэма і на кожнай касе ў кожным магазіне вялікімі літарамі — «прад'явіце дакументы». У тым горадзе, дзе «падае працоўная дысцыпліна ў многіх установах, арганізацыях, на прадпрыемствах». У тым, дзе «працоўныя з энтузіязмам успрынялі і гатовы даць адпор антысацыялістычным і безадказным элементам». У гэтым шматпакутным горадзе, як ні дзіўна, можна сустрэць чалавека, які затрачвае прафесарскую зарплату на тоўстыя часопісы па мастацтву, літаратуры, на кнігі і зусім не прымае слоў «працоўны энтузіязм» і «безадказныя элементы». Затое, калі з'яўляецца магчымасць накіраваць некалькі студэнтаў вучыцца ў вельмі багатую і зараз ужо сяброўскую краіну, ён знаходзіць спосаб накіраваць тых, хто сапраўды здольны і дастойны.

Так што, хоць і не да канца зразумела, навошта інтэлігенту станавіцца дэпутатам і як ён можа да гэтага часу спадзявацца на поспех чарговага неразважлівага «хаджэння ў народ», відавочна, што, калі ў гэтай краіне яшчэ ёсць такія людзі, напэўна, не ўсё страчана.

Т. БЯЛЬКЕВІЧ.

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

Ігар Аляксандравіч вядомы як стваральнік навуковай школы, выдатны вынаходнік. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтаваны адна доктарская і 8 кандыдацкіх дысертацый.

Ігар Аляксандравіч Малевіч распрацаваў асновы тэорыі і стварыў шэраг шматфункцыянальных радыёфізічных сістэм для лакацыі, доплераўскай анемаметрыі і інтэрфераметрыі рухомых аб'ектыў і асяроддзяў. Вялікі навуковы інтарэс уяўляюць манаграфіі прафесара І. А. Малевіча па актуальных праблемах радыёфізікі.

Б. ЕРМАКОЎ,
прафесар Дзяржаўнага аптычнага інстытута імя С. І. Вавілава.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА

22 ЛЮТАГА
Зак. 2004

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.